І. КРЫВАШЛЫКАВА
бібліятэкар Хорастаўскай сельскай экалагічнай бібліятэкі-філіяла № 34 ДУК "Салігорская цэнтральная раённая бібліятэка"

# "Мой родны кут, дарыў ты мне натхненне..."

## Сцэнарый адкрыцця выставы твораў мастака Фёдара Валодзькі



Вядучы 1.

*Родны кут дарыў яму натхненне,*
*Для плённай працы сілы надаваў,*
*Старонкі роднай розныя адценні*
*У карцінах, што ён намаляваў...*

Вядучы 2. Добры дзень! Вітаем вас на мерапрыемстве, прысвечаным адкрыццю выставы карцін нашага земляка, чалавека, якога ўзгадавала Хорастаўская зямля, — мастака Фёдара Адамавіча Валодзькі.

Вядучы 1. Як у творчасці пісьменнікаў ёсць творы, прысвечаныя Радзіме, так і мастакі імкнуцца перадаць праз малюнак усю прыгажосць роднага краю. Малая радзіма... Што ў гэтых словах? Няспешная плынь ракі, вясёлы гоман птушак, мядовы водар лугавога разнатраўя? Ці мерны гук дажджу і нясмелыя пробліскі сонца праз барвова-залатое лісце? А можа, марозны пах студзеньскай раніцы і роўны слуп дыму над комінам бацькоўскай хаты? Кожны з нас надае свой сэнс словам "малая радзіма".





**Вядучы** 2. Шчымлівай радасцю б'ецца сэрца, калі ўспамінаеш прыгажосць роднага краю. Але як часта мы назіраем за дзівосамі прыроды? ЦІ бачым у шэрай восеньскай раніцы ці ў спякотным летнім дні тое, што можа спыніць нас і вырваць з мітусні паўсядзённых спраў, каб паразважаць аб вечным... А сустракаючыся з работамі мастакоў, якія дапамагаюць нам у гэтым, мы атрымліваем не толькі эстэтычнае задавальненне. Радасць, якую мы адчуваем у такія моманты не толькі душэўная, але і духоўная.

Дзеля таго, каб у адной карціне ўбачыць увесь сусвет, прачытаць гісторыю, нараджаюцца і працуюць такія таленты, як Фёдар Адамавіч.

**Вядучы** 2. Фёдар Валодзька нарадзіўся 12 красавіка 1952 года ў вёсцы Хорастава. Вучыўся ў Хорастаўскай сярэдняй школе. Закончыў Навапалацкае вучылішча нафтавікоў і двухгадовыя курсы Маскоўскага завочнага народнага ўніверсітэта мастацтваў. Служыў у Савецкай арміі на пасадзе пісара штабнога справаводства. Пасля арміі працаваў у ААТ "Беларуськалій".

**Вядучы** 1. Але тагачасны старшыня калгаса Ваўчок Аляксей Якаўлевіч запрасіў Фёдара Адамавіча ў калгас "Партызанскі край" на пасаду мастака-афарміцеля, дзе ён і працаваў 42 гады — з 1973 па 2015 год.

**Вядучы** 2. Вельмі значны ўнёсак зрабіў Фёдар Валодзька ў афармленне музея імя Героя Савецкага Саюза Васіля Захаравіча Каржа, які дзейнічае ў вёсцы Хорастава.

**Вядучы** 1. Фёдар Адамавіч займаўся таксама разьбой па дрэву. Яго рукамі створана ўбранства храма Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў той жа вёсцы. Работы Ф. Валодзькі ўпрыгожваюць інтэр'ер памяшкання Хорастаўскай сярэдняй школы.



**Вядучы** 2. Разьбой па дрэву афармлены стэлажы, інфармацыйныя стэнды ў Хорастаўскай сельскай бібліятэцы. Але асабліва яскрава талент мастака знайшоў адлюстраванне ў пейзажах і партрэтах. Яго карціны разышліся далёка за межы Беларусі. Прыемна, што краявіды нашай малой радзімы, намаляваныя з любоўю і пашанай, радуюць сэрцы нашых землякоў, якія жывуць у іншых краінах.

**Вядучы** 1. Жывапіс выклікае своеасаблівае пачуццё, таму што мастак укладае ў творчасць часцінку сваёй вельмі чулай душы.

**Вядучы** 2. Сёння разам з намі ўдава Фёдара Адамавіча — Ніна Анатольеўна. Пражыўшы ў шлюбе з мастаком нямала гадоў, яна нясе ў сабе часцінку яго таленту. З вялікай павагай яна беражэ яго творчасць. Дзякуючы Ніне Анатольеўне і дачцы Ірыне Фёдараўне і арганізавана гэтая выстава.

**Вядучы** 1. На карцінах Фёдара Адамавіча мы можам убачыць знаёмыя мясціны: дарогу да ракі Лань, мясцовыя краявіды... Мастак на палатне пакінуў шчаслівыя моманты — моманты, калі яго рукой правіла адухаўленне...

**Вядучы** 2. Услухайцеся, калі ласка, у наступныя радкі Максіма Багдановіча...

*Маленькая, няяркая вясёлка*
*У вышыні ледзь бачна зіхаціць,*
*Яе не кожны нават і прыкмеціць,*
*Хто ў гэты час на неба паглядзіць.*
*Маленькая, няяркая вясёлка,*
*За гэта ты і даспадобы мне,*
*Што я адну з табою долю маю —*
*Зіяць ледзь бачна ў сіняй вышыне.*

**Вядучы** 1. І няхай у маштабе сусвету талент Фёдара Адамавіча — быццам маленькая, няяркая вясёлка, але ж для нас, яго землякоў, гэта цэлы небасхіл, з яго безліччу фарбаў і адценняў, у якім кожны убачыць нешта сваё — захапляльнае і таямнічае...

А зараз прапаную вам, паважаныя госці, бліжэй пазнаёміцца з творчасцю мастака. Калі ласка! *(Гасцей запрашаюць да прагляду карцін.)*